№№143—144
(2663—2664)

6 верасня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

СУДЫ

Іван ШЫЛА і Наста АЗАРКА:

«Ад “Маладога фронту” не адрачомся»

4 верасня ў Салігорску і Нясвіжы распачаліся судовыя працэсы над актывістамі незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт” Іванам Шылам і Настай Азарка.

Маладых людзей абвінавачваюць па сумнавядомым 193-м артыкуле Крымінальнага кодэкса “Дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі”. Напярэдадні судоў карэспандэнт “Народнай волі” паразмаўляў з маладзёжнымі актывістамі пра тое, чаго яны чакаюць ад суда і як ставяцца да сітуацыі, што склалася.

Непрыемнасці для непаўнагадовага салігорскага маладафронтаўца Івана Шылы пачаліся з вобыску, які на яго прыватнай кватэры здзейснілі супрацоўнікі КДБ. *“Тады ў мяне канфіскавалі ўласны камп’ютэр, але ніякай крамольнай інфармацыі ў ім знойдзена не было”*, — сказаў Іван Шыла.

Зразумела, што фармулёўка *“дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі”* даволі агульная, па сутнасці пад яе можна падагнаць усё што заўгодна. Іван Шыла даўно азнаёміўся з матэрыяламі сваёй крымінальнай справы і таму яшчэ напярэдадні суда распавёў, на чым грунтуецца абвінавачванне супраць яго. *“Першым і галоўным пунктам абвінавачвання мне выставілі тое, што я нібыта ўзначальваю салігорскую арганізацыю незарэгістраванага ”Маладога фронту”*, — кажа Іван. — *Аднак, гэтае абвінавачванне — беспадстаўнае, бо, згодна са Статутам арганізацыі (праект неаднойчы прадастаўляўся Мінюсту пры спробах афіцыйнай рэгістрацыі арганізацыі), гэтага проста не можа быць. Я ж непаўнагадовы. Акрамя гэтага, мяне абвінавачваюць у арганізацыі шэрагу акцый, прымеркаваных да Дня салідарнасці, якія праходзілі на тэрыторыі Салігорска. І ўсё ж самае абсурднае абвінавачванне — тое, што я быў ініцыятарам кампаніі па беларусізацыі грамадскага транспарту ў Салігорску”.*

Сапраўды, “злачынства” такое, што хлопца трэба было б узнагароджваць!

Хлопец кажа, што на судзе не збіраецца адмаўляць той факт, што з’яўляецца сябрам “Маладога фронту”. *“Адракуся ад ”Маладога фронту” — значыць адракуся ад Беларусі”*, — гаворыць Іван.

Разглядае справу Івана Шылы суддзя Лапіна. Ніякіх ілюзій наконт выніку судовага пасяджэння ў Івана Шылы няма: *“Па-мойму, усім зразумела, што гэты працэс — цалкам палітычна матываваны. Ні пяць тамоў маёй крымінальнай справы, ні выступленні адвакатаў не будуць вырашаць ход працэсу. Усё будзе залежыць ад таго, які загад паступіў зверху. Настройваюся на самае горшае: гэта можа быць арышт альбо вялікі штраф. Аднак ніякіх песімістычных нотак у маіх словах не шукайце. Напярэдадні суда скажу так: хай усё будзе, як будзе. Я не лічу сабе вінаватым, і гэта галоўнае”.*

Зранку 4 верасня паступіла інфармацыя, што на ўездзе ў Салігорск супрацоўнікамі міліцыі былі затрыманы беларускі праваабаронца Валянцін Стэфановіч і некалькі яго замежных калег. Яны ехалі на суд над Іванам Шылам...

А вось што расказала напярэдадні судовага пасяджэння яшчэ адна актывістка “Маладога фронту” Наста Азарка, працэс над якой распачаўся ў той жа дзень у Нясвіжы: “Апошнім часам я толькі і жыла чаканнем гэтага суда. Страху няма. Адмаўляць сваю прыналежнасць да ”Маладога фронту" не збіраюся".

У аснову абвінавачвання Насты Азаркі ляглі эпізоды, падобныя на тыя, у якіх абвінавачваюць Івана Шылу. *“Мяне абвінавачваюць у тым, што я рэгулярна з 2006 года ўдзельнічала ў пасяджэннях і мерапрыемствах, якія ладзіў ”Малады фронт". Абвінавачваюць у тым, што я ўдзельнічала ў пэўных акцыях на тэрыторыі Нясвіжа. Акрамя таго, мне інкрымінуюць абразу такой арганізацыі, як БРСМ. Гэта, нібыта, выявілася ў тым, што я распаўсюджвала налепкі з тэкстам “Живи веселей — стучи на друзей”.*

У адрозненне ад Івана Шылы Насце, як поўнагадовай, максімальным пакараннем можа стаць “хімія”. Але дзяўчына стараецца не думаць пра дрэннае. “Загадваць не люблю, хай што будзе, тое і будзе”, — гаворыць яна.

Варта адзначыць, што пачатак судовых працэсаў над актывістамі “Маладога фронту” амаль супаў з датай дзесяцігоддзя арганізацыі, якое адзначаецца 6 верасня. А на 10 верасня прызначана дата суда над яшчэ адным актывістам незарэгістраванай арганізацыі — Яраславам Грышчэнем. Працэс распачнецца ў Баранавічах. Адбываюць пакаранне ў калоніі актывісты “МФ” Дзмітрый Дашкевіч і Артур Фінькевіч. І ўсё ж ніхто з “маладафронтаўцаў” не адракаецца ні ад сваіх сяброў, ні ад сваіх ідэй...

У судовым працэсе над Настай Азарка пракурор запатрабаваў прысудзіць дзяўчыне штраф у памеры 500 базавых велічынь (15,5 мільёна беларускіх рублёў). Аднак суддзя Дунаева вынесла ў дачыненні да маладзёжнай актывісткі “больш мяккі” прысуд. Азарка аштрафавана “ўсяго” на 40 базавых велічынь.

Суд у Салігорску распачаўся з інцыдэнту. Сіламі спецназа жорстка былі разагнаны тыя, хто прыйшоў падтрымаць Івана Шылу. Затрымана каля 15 чалавек. Сам Шыла даваць паказанні ў судзе адмовіўся і прапанаваў суддзі адразу вынесці прысуд, мінуючы ўсе фармальнасці. Тым не менш на судзе ў Салігорску пракурор выступіў з дзіўнай просьбай: асудзіць Івана Шылу... без пакарання. Суд прызнаў Івана вінаватым і вынес яму папярэджанне.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЧУЛІ?

Пратэст пераносіцца

Страйк індывідуальных прадпрымальнікаў Беларусі пераносіцца з верасня на кастрычнік. Прычынай пераносу акцый пратэсту называецца неабходнасць лепшай падрыхтоўкі да акцыі.

Рашэнне перанесці рэспубліканскі страйк прынята лідэрамі прадпрымальніцкага руху.

Адзін з заснавальнікаў руху “За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва” Віктар Гарбачоў адзначыў, што перанос акцый звязаны з неабходнасцю больш грунтоўна падрыхтавацца да пратэсту.

“Людзі не супраць пратэсту, — тлумачыць Віктар Гарбачоў. — Асабліва калі ўлады не адменяць указ №760, калі будуць працягвацца рэпрэсіі з канфіскацыямі. Аднак існуе неабходнасць больш грунтоўна падрыхтавацца да пратэсту. Калі мы цяпер, без належнай падрыхтоўкі, правядзём дробныя акцыі пратэсту, мы толькі ўшчыкнём уладу, а сабе нанясём шкоду”.

Таму прадпрымальнікі вырашылі крыху пачакаць з публічнымі выступленнямі, атрымаўшы магчымасць за месяц “пашырыць геаграфію пратэсту”. Аднак праблема выжывання настолькі вострая, што ўзнікла пільная патрэба вынесці яе на шырокае абмеркаванне. На наступным тыдні чакаецца сход-нарада рэгіянальных лідэраў прадпрымальніцкага руху, на якім і будуць абмяркоўвацца магчымыя варыянты пратэсту.

“У кастрычніку, відаць, мы правядзём аднадзённы папераджальны страйк; ацэнім свае сілы і ўбачым рэакцыю ўлады. Затым хутчэй за ўсё мы арганізуем мнагадзённы страйк, яшчэ пазней — пікеты”, — кажа Віктар Гарбачоў.

Пратэст выльецца на вуліцу з адной мэтай — спыніць знішчэнне ІП. Дзеля таго трэба дабіцца добраахвотнага пераходу ў прыватныя унітарныя прадпрыемствы замест прапануемага пагалоўнага пераходу; пажадана дабіцца адмены ўказа №760. Вянцом пратэсту мусіць стаць прыняцце закона аб дробным і сярэднім бізнесе.

“Мы жывём па дэкрэтах, указах і пастановах, якія ледзь не штодня мяняюць правілы гульні, — кажа Віктар Гарбачоў. — Мы хочам дабіцца прыняцця закона аб дробным і сярэднім бізнесе, што дазволіла б нам працаваць без аглядкі на патрэбы ўлады”.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

БРЮССЕЛЬ—МИНСК

Белорусских дипломатов пригласили для того, чтобы они посмотрели, что теряют

В понедельник 3 сентября в Брюсселе прошла крупная международная конференция под названием “Работая вместе — укрепляем европейскую политику добрососедства”. Рядовое мероприятие привлекло внимание тем, что впервые на него была приглашена официальная белорусская делегация.

В столицу Евросоюза съехались руководители дипломатических миссий всех 15 стран, определенных как “соседи ЕС”. Слово дали каждому министру, на выступление выделялось не более пяти минут. За соблюдением регламента следил специальный секундомер, отсчитывая время на огромном мониторе, вывешенном в зале. Не привыкшие к подобным спортивным новшествам министры говорили на удивление быстро, регулярно поглядывая на цифры на секундомере. Говорили в основном об интересах своих стран, о необходимости развивать сотрудничество с ЕС в самых различных сферах, прежде всего экономической. Не оставили без внимания высокопоставленные чиновники и вопросы упрощения визового режима, эффективной борьбы с нелегальной миграцией и контрабандой, а также преодоления барьеров в торговле. Дальше всех пошел министр Палестинской автономии, повторив несколько раз, что “Евросоюз должен финансировать палестинскую экономику”, вызвав тем самым невольные улыбки коллег.

Бенита Ферреро-Вальднер — генсеку НАТО Яапу де Хооф Схефферу: “Я — за добрососедство, а ты?”

Один из главных организаторов семинара — верховный комиссар Европейского Союза по внешним связям Бенита Ферреро-Вальднер “отстреливалась” обещаниями. *“Все товары, включая картошку и лекарства, в скором времени должны поступать на западноевропейский рынок без всяких ограничений и препятствий”*, — пообещала она. А также добавила, что уже в конце года граждан Украины и Молдовы ждет “значительное упрощение визового режима с Европой”...

Напомним, что Европейская политика добрососедства (ЕПД) охватывает 15 стран, в том числе Азербайджан, Армению, Грузию, Украину, Египет, Израиль и даже вышеупомянутую Палестинскую автономию, которая уж никак не может граничить с Европой географически. Зато граничащая с ЕС Беларусь в этой популярной программе объединенной Европы остается реальной черной дырой. В ходе форума, который длился целый световой день, слово “Беларусь” упомянули лишь два человека — министр иностранных дел Словакии Ян Кубиш, который назвал нашу страну “ангажированной”, и его литовский коллега Пятрас Вайтекунас, напомнивший слушателям, что белорусы, как и другие участники ЕПД, тоже хотят упрощения визового режима и удешевления шенгенской визы.

Но голос главы литовского МИД, как оказалось, стал “гласом вопиющего в пустыне”. Никто из руководства ЕС на реплику Вайтекунаса никак не отреагировал, а заместителю министра иностранных дел Беларуси Валерию Воронецкому вообще дали слово в самую последнюю очередь, вне регламента, и то только после настоятельных просьб присутствовавших на конференции представителей белорусских общественных организаций.

Воронецкий говорил, что топором рубил. Громко, резко, медленно зачитывая с бумажки заранее заготовленный текст о том, что Беларусь готова к сотрудничеству с ЕС, но исключительно “в вопросах энергетики, охраны окружающей среды, инвестиций в экономику, в борьбе с нелегальной миграцией” (мол, в другие вопросы не лезьте), про “необходимость перейти от слов к делам”, про то, что “Беларусь и ЕС одинаково важны друг для друга”. Ни слова, ни полслова не упомянул г-н Воронецкий об известных 12 требованиях Евросоюза, о готовности провести в Беларуси свободные демократические выборы, о намерении прекратить охоту на оппозицию и независимые СМИ. Читал только заготовленный текст!

К слову, Воронецкий был единственным участником форума, который выступал по-русски. Все остальные его коллеги делали это по-французски или по-английски. Видимо, новому поколению белорусских дипломатов совсем не обязательно в совершенстве владеть иностранными языками. Тем более что Еврокомиссия решила эту проблему заранее, пригласив русскоязычных синхронных переводчиков.

Следует отметить также, что представителей официальной Беларуси позвали на брюссельскую конференцию в самый последний момент. Как заявила накануне форума на специальной пресс-конференции Бенита Ферреро-Вальднер, белорусских дипломатов пригласили лишь для того, чтобы “они посмотрели, что теряют”.

Кстати, согласно официальному интернет-сайту ЕПД *(http://ec.europa.eu/world/enp/)*, финансирование Европейской программы добрососедства с 2007-го по 2013 год составляет 12 миллиардов евро, что на треть больше, чем в 2000—2006 годах. Но вот только из географических соседей ЕС в программу добрососедства не входит только Беларусь. Почему? Чиновники Еврокомиссии дают простой ответ: “Европа начнет сотрудничать с белорусским руководством только тогда, когда в стране установится демократическая форма правления, которая явится следствием свободных и справедливых выборов”.

Дополняет это высказывание президент Еврокомиссии Жозе-Мануэль Баррозо, который заявил на брюссельской конференции, что “ЕС в выборе участников программы добрососедства руководствуется в какой-то степени принципом ”ты — мне, я — тебе": чем быстрее в стране-кандидатке на деньги Евросоюза проводятся демократические реформы, тем больше и оперативнее мы сможем помочь".

Александр СИЛИЧ.
Специально для “Народной воли”.

На базе «Криницы» планируется создать холдинг

Рассматривается проект укрупнения ведущего пивоваренного предприятия Беларуси ОАО “Криница”. Об этом агентству ПРАЙМ-ТАСС сообщил источник, близкий к правительству.

“Одним из вариантов дальнейшего развития пивоваренной отрасли в стране может быть создание крупного холдинга, который мог бы объединить усилия тех предприятий, которые находятся в собственности государства. Другими словами, в короткие сроки надо создать мощное предприятие, которое могло бы противостоять конкурентам. Нужна капитализация ликвидных активов. Наиболее приемлемым представляется присоединение к ОАО ”Криница" одного или нескольких пивоваренных белорусских предприятий, что позволит увеличить мощности “Криницы” без вложения иностранных инвестиций", — сказал собеседник.

Как ранее сообщалось, Александр Лукашенко на совещании 23 августа предложил реализовать проекты по модернизации предприятий пивоваренной промышленности за счет внутренних источников, без привлечения иностранных инвестиций. Лукашенко поручил участникам совещания прийти к единому решению и в первой декаде сентября внести на рассмотрение свои предложения с проектами соответствующих нормативных документов.

БЕЛАРУСЬ — РАСІЯ

Пуцін застаецца?

Уладзімір Пуцін вызначыўся з трэцім тэрмінам прэзідэнцкага праўлення. Ён збіраецца стаць прэзідэнтам Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Такую заяву ў эфіры расійскага “Народнага радыё” зрабіў намеснік старшыні Дзярждумы Сяргей Бабурын.

Па яго словах, расійскі бок прапанаваў менавіта такую мадэль кіравання Саюзнай дзяржавай, аднак беларускі бок пакуль не прыняў адпаведнага рашэння.

Версія, што Уладзімір Пуцін можа застацца ў вялікай палітыцы як прэзідэнт Саюзнай дзяржавы, гучала неаднойчы. У той жа час звернем увагу на тое, што Бабурын — не “прыпуцінскі”, а “прылукашэнкаўскі” палітык. І з яго вуснаў, як правіла, гучаць заявы, якія выгадныя беларускаму кіраўніцтву.

Афіцыйных каментарыяў наконт заявы расійскага віцэ-спікера пакуль няма.

ПАЛІТКУХНЯ

30 верасня — агульнанацыянальны дзень пратэсту

У межах асенняй палітычнай кампаніі Аб’яднаных дэмакратычных сіл у краіне распачаўся “Сацыяльны марш”. Рашэнне аб правядзенні падобнай кампаніі было прынята яшчэ на другім Кангрэсе аб’яднаных дэмакратычных сіл у маі гэтага года.

“Сацыяльны марш — гэта не разавая акцыя. Гэта кампанія, якая ўключае ў сябе цэлы комплекс масава-палітычных мерапрыемстваў з мэтай прымусіць улады змяніць сацыяльную палітыку ў краіне”, — паведаміў старшыня аргкамітэта па правядзенні маршу Валерый Ухналёў.

Восенню бягучага года ў межах гэтай кампаніі плануецца правесці тры важныя мерапрыемствы. 30 верасня ў агульнанацыянальны дзень пратэсту запланавана правядзенне пікетаў ва ўсіх рэгіёнах краіны. Іх мэта — звярнуць увагу ўладаў на сітуацыю са стратай сацыяльных гарантый і льгот некаторымі катэгорыямі насельніцтва: “Пад удар трапілі ўсе — ад студэнтаў да пенсіянераў. Пікеты пройдуць ў любым выпадку, нават пры адсутнасці афіцыйных дазволаў. Усяго па краіне мы запланавалі каля 3000 пікетаў”, — сказаў Валерый Ухналёў.

На 2 кастрычніка — першы дзень асенняй сесіі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — запланавана перадача подпісаў грамадзян Беларусі супраць прынятага закона, які ліквідаваў сацыяльныя гарантыі.

А 4 лістапада ў Мінску павінны адбыцца мітынг і дэманстрацыя. Мэта мерапрыемства ўсё тая ж — прыцягненне ўвагі ўладаў і грамадзян да сітуацыі з сацыяльнымі гарантыямі насельніцтву.

“На гэтым тыдні мы пададзім заяўку ў Мінгарвыканкам. Плануемы маршрут ”Сацыяльнага маршу" — Кастрычніцкая плошча — Нацыянальная бібліятэка. Заяўка наўмысна будзе пададзена амаль за два месяцы да акцыі, каб ва ўладаў быў час падрыхтаваць адказ", — сказаў Валерый Ухналёў.

У сваю чаргу старшыня АДС Анатоль Лябедзька адзначыў, што “першыя вынікі сацыяльнай кампаніі дэмсіл ужо можна памацаць рукамі”: “У нас ёсць даставерная інфармацыя, што ў адміністрацыі Лукашэнкі адразу пасля таго, як дэмсілы актывізавалі дзейнасць па ўздыме праблем сацыяльнай праблематыкі, прайшла нарада з удзелам міністраў, сілавікоў і прадстаўнікоў СМІ. Улады баяцца масавых народных выступленняў і таму прынялі рашэнне крыху падняць заробкі бюджэтнікам і пенсіі”.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ПРЭЦЭДЭНТ

Суд вярнуў маёмасць бацькам Сяргея Скрабца

За гэтым працэсам усе сачылі з асаблівай цікавасцю. У Беларусі праваахоўныя органы спрабавалі стварыць прэцэдэнт, калі бацькі неслі б маёмасную адказнасць за даўгі поўнагадовага сына. Калі дакладней, то спрабавалі забраць маёмасць у бацькоў былога дэпутата Сяргея Скрабца ў кошт аплаты даўгоў фірмы, якой некалі кіраваў іхні сын.

У 2005 годзе Вярхоўны суд Беларусі прызнаў дэпутата Палаты прадстаўнікоў 2-га склікання Сяргея Скрабца вінаватым у невяртанні “Беларусбанку” крэдыту памерам больш за 500 тысяч долараў. Нягледзячы на доказы таго, што крэдыт не вернуты з-за незаконнага арышту рахункаў ягонай фірмы, Сяргей Скрабец быў прызнаны вінаватым і пазбаўлены волі на 2,5 года. У Сяргея Скрабца і ягонага брата Аляксандра, які таксама меў дачыненне да дзейнасці фірмы, была канфіскавана маёмасць. Але “Беларусбанку” таго падалося мала, і цяпер банк запатрабаваў канфіскаваць ды перавесці сабе ў прыбытак таксама хатнюю маёмасць бацькоў экс-дэпутата.

“Калі мяне арыштавалі, то праводзілі ператрус у мяне, у брата і ў маіх бацькоў. Яны лічаць цяпер, што ўсё, што набывалі мае сваякі, гэта ўсё трэба канфіскаваць”, — кажа Сяргей Скрабец.

У сакавіку 2007 года суд Першамайскага раёна Мінска ўжо разглядаў справу аб канфіскацыі маёмасці. Тады суд стаў на бок бацькоў палітыка: пра іхнюю маёмасць у рашэнні Вярхоўнага суда нічога не гаварылася. Аднак пракуратура аспрэчыла судовае рашэнне, і Мінскі гарадскі суд вярнуў справу на перагляд. І ўсё ж Першамайскі суд Мінска задаволіў іск бацькоў экс-дэпутата Сяргея Скрабца і вызваліў з-пад арышту іх хатнюю маёмасць.

Юры КОБА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 ВЕРАСНЯ 2007 г.

ВЕДАЙ НАШЫХ!



Уладзімір БАЗАН. З серыі "Чарнобыльскі нацюрморт".

Скрозь прызму таленту і сумлення

Чарговай творчай перамогай абярнуўся для вядомага не толькі на радзіме, але і за яе межамі віцебскага фотажурналіста ***Уладзіміра БАЗАНА*** *ўдзел у рэспубліканскім фотаконкурсе «Мая Беларусь»*

Конкурс быў арганізаваны творчай суполкай "Фотамастацтва" і рэдакцыяй часопіса "Фотамагія" пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры і Нацыянальнага мастацкага музея.

Свае работы на конкурс прадставілі каля 300 фатографаў з розных гарадоў краіны. У намінацыі "Чалавек (жанр)" першае месца заваяваў Уладзімір Базан. Журы было ў захапленні ад ягонай серыі "Жаўнер", "Ахова", "Чарнобыльскі нацюрморт".

Варта адзначыць, что Ул.Базан — адзін з заснавальнікаў і нязменны рэдактар недзяржаўнай газеты "Витебский курьер", і з гэтай прычыны віцебскія ўлады забаранілі мясцовым казённым выданням друкаваць здымкі гэтага майстра і нават узгадваць ягонае імя на сваіх старонках. Так што чытачы "Народнай волі" першымі могуць пабачыць сёння адну з работ Ул.Базана, удастоеных першага месца на вельмі прадстаўнічым і сапраўды аб'ектыўным конкурсе.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПАЛІТКУХНЯ

Сацыял-дэмакраты збіраюць камяні

Час раскідваць камяні скончыўся, прыйшла пара збіраць раскіданае да аднае кучы. Такі лейтматыў сумеснай заявы мінскіх гарадскіх арганізацый Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і БСДГ.

На супольным пасяджэнні Мінскія гарадскія арганізацыі БСДП на чале з генералам Валерыем Фраловым і БСДГ пад кіраўніцтвам Сяргея Скрабца прынятая заява пра неабходнасць яднання сацыял-дэмакратычных сіл Беларусі. "Мы звяртаемся да кіраўнікоў сваіх партый — Аляксандра Казуліна і Станіслава Шушкевіча з патрабаваннем пачаць аб'яднаўчы працэс сацыял-дэмакратаў Беларусі. Мы просім далучыцца да гэтага працэсу сацыял-дэмакратаў Міколы Статкевіча".

"Сёння наша краіна мае патрэбу ў пераменах, — гаворыцца ў супольнай заяве. — Мы страцілі добрасуседскія стасункі з аб'яднанай Еўропай і Расіяй. Знешняя палітыка, якую праводзіць кіроўны рэжым, прывяла Беларусь да міжнароднай ізаляцыі. Цяпер як ніколі востра паўстае пытанне будучыні нашай краіны, нашых дзяцей. Змена дыктатарскага рэжыму непазбежная ў найбліжэйшы час. І ад таго, у чыіх руках апынецца ўлада, пойдзем мы дэмакратычным шляхам ці па-ранейшаму застанемся краінай-ізгоем на звалцы гісторыі. Нам, сацыял-дэмакратам, дзяліць няма чаго, акрамя арыштаў ды турэмных камер на Акрэсціна. Аб'яднаўшыся, мы, як рэальная сіла ўнутры краіны, можам процістаяць палітыцы ўдушэння грамадства і знайсці разуменне і падтрымку на міжнароднай арэне".

Старшыня аргкамітэта па стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікола Статкевіч заявіў, што ён "станоўча" ставіцца "да любых аб'яднальных працэсаў". Аднак пры гэтым палітык зрабіў адну агаворку: казаць пра аб'яднанне ўсіх сацыял-дэмакратычных сіл можна пры "ідэалагічнай сумяшчальнасці, ідэалагічным аб'яднанні". *"Еўрапейская інтэграцыя — вось той стратэгічны накірунак, стратэгічная мэта, вакол якой мусяць весціся перамовы пра аб'яднанне. Калі гэта стане рэальнасцю, у чым я сумняваюся, бо маю сумны вопыт, але калі ж усё-такі гэта стане рэальнасцю, то перамовы не маюць права весці тыя людзі, якія ў свой час здавалі сваіх калег па дэмакратычным лагеры гэтай уладзе ці якія праславіліся непрыгожымі дзеяннямі з маёмасцю"*, — адзначыў Мікола Статкевіч.

Калі аўтар запытаўся ў старшыні БСДГ Станіслава Шушкевіча пра яго стаўленне да "ініцыятывы Скрабца—Фралова", С.Шушкевіч двойчы перапытаў: "Чыя-чыя ініцыятыва?" Урэшце, зразумеў...

"Ідэя даўняя, і колькі ўжо пра гэта гаворыцца! — зазначыў Станіслаў Шушкевіч. — *Але ж тут існуе такая закавыка: кожны хоча, каб аб'ядноўваліся "пад ягоным кіраўніцтвам". У нас быў такі Казулін, у нас ёсць Мікола Статкевіч, у нас былі многія палітыкі... Але чамусьці ніколі не прапаноўваліся спакойныя дэмакратычныя прынцыпы яднання. Па-другое, ёсць асобы, якія паказалі сябе не вельмі прыстойнымі людзьмі. Я — за аб'яднанне, але калі вы запытаецеся мяне, як гэта зрабіць, — я не змагу адказаць. Ёсць асобы, якія перабягалі з партыі ў партыю; калі прыходзіліся не да месца, яны вярталіся назад. Я — за аб'яднанне на дэмакратычнай аснове. Але ж у нас ёсць і Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, працаваць у межах якіх сацыял-дэмакратам ніхто не забараняў".*

РЭХА ТРАГЕДЫІ

У алтайскіх гарах знайшлі цела беларускага альпініста

Пакуль нават невядома, каго канкрэтна знайшлі на Алтаі. Хутчэй за ўсё гэта беларус Кірыл Каршак, які знік на гары Бялуха ліпені 2005 года. Нагадаем, у ліпені 2005 года група беларускіх альпіністаў рабіла ўзыходжанне на гару Бялуха, вышыня якой 4506 метраў. Пасля сыходу лавіны выжыць удалося толькі пяцярым з дзевяці беларусаў. Дваіх з іх — Георгія Маскалёва і Кірыла Каршака — ратавальнікам знайсці так і не ўдалося.

Два гады запар пасля трагедыі выжыўшыя альпіністы ўласнымі сіламі арганізоўвалі пошукавую экспедыцыю, аднак знайсці сяброў ім ніяк не ўдавалася. І вось нарэшце...

Умерзлага ў лёд чалавека заўважылі праходзіўшыя міма турысты. Пошукава-выратавальны атрад дастаў цела з рашчыліны. Зараз вядома, што чалавек, якога знайшлі ратавальнікі, быў захутаны ў аранжавы спальнік. Яшчэ адна прыкмета, па якой яго можна апазнаць, — гадзіннік.

Ратавальнікі спусцілі знойдзенае цела на вышыню 3200 метраў. Далей сітуацыя можа развівацца двума шляхамі. Калі знойдзены альпініст сапраўды з'яўляецца беларусам, то яго цела (пры наяўнасці сродкаў і жадання сваякоў) могуць даставіць на радзіму. Па нашай інфармацыі, дыпламаты ўжо высвятляюць, каго знайшлі ў гарах Алтая. Але калі даставіць альпініста на радзіму не ўдасца, то хутчэй за ўсё ён будзе пахаваны прама на гары.

Бацька аднаго са зніклых альпіністаў — Алег Маскалёў — паведаміў "Народнай волі", што на Алтаі знайшлі цела не ягонага сына, а Кірыла Каршака. "Па тых прыкметах, якія названыя, — цяльняшка, гадзіннік, аранжавы спальнік — гэта ўсё ж такі не наш Георгій, а ягоны сябра".

Да сваякоў Кірыла Каршака нам датэлефанавацца не ўдалося. Магчыма, яны ўжо на Алтаі. Таму падрабязнасці наша газета паведаміць у наступных нумарах.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

КАМЕНТАРЫЙ

Сяргей СКРАБЕЦ: «Трэба быць разам»

Чым кіраваліся палітыкі, паднімаючы праблему, якая ўжо нагнала аскому? Вось што кажа Сяргей Скрабец:

— Гэтая праблема мае некалькі падводных камянёў. Пытанне пра аб'яднанне сацыял-дэмакратычных партый — не новае. У нас адна ідэалогія, задачы, агульныя каштоўнасці. Навошта пладзіць 10 сацыял-дэмакратычных партый? Хай бы была адна, але моцная. Мы, сацыял-дэмакраты, намінальна існуем, а фактычна як сілы нас няма. Мы спрабавалі высветліць, якая ж з партый з'яўляецца членам Сацыялістычнага Інтэрнацыянала. Мікола Статкевіч лічыць, што ягоны аргкамітэт; выканаўца абавязкаў старшыні БСДП Ляўковіч кажа, што ягоная партыя; у Станіслава Шушкевіча свая пазіцыя. На міжнародным узроўні няма партыі, якая б прадстаўляла інтарэсы беларускай сацыял-дэмакратыі. Чаму Мілінкевіч на міжнародным узроўні амаль не гаворыць пра тое, што на Беларусі ўжо паўтара года за кратамі сядзіць Аляксандр Казулін, які спрабаваў абараніць правы чалавека. Баіцца палітычнай канкурэнцыі?.. Аднак трэба ўсведамляць і тое, што хай сабе павольна, але краіна рухаецца да "цывілізаванай дыктатуры" — па казахскім варыянце. Будзе адна партыя, якая будзе і ў парламенце, і ў адміністрацыі прэзідэнта, і ўсюды. Вы думаеце, чаму цяпер так актыўна Чаргінец стварае "Белую Русь"?.. Дык трэба проціпаставіць такты ўладаў сваю тактыку, сваю гульню.

А беларускія сацыял-дэмакраты дык і наогул загналі самі сябе ў прыдуманую ізаляцыю.

Асабіста я не рвуся нічым кіраваць, для мяне значэнне мае толькі палітычны складнік. Гэта партыя мусіць быць рэальнай сілай, здольнай пастаяць і абараніць сваіх сяброў. Наша ж апазіцыя — то аб'ядноўваецца, то раз'ядноўваецца. А на справе нічога не адбываецца — гэта камедыя з некалькімі дзеючымі асобамі.

Я прапаноўваў правесці аб'яднаўчы з'езд, але да маіх слоў не прыслухаліся. Аднак дзеля агульнай справы сацыял-дэмакраты маглі б і аб'яднацца. Трэба было б аб'яднацца.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ПАМЯЦЬ

Улады спрабуюць утаіць ад грамадскасці месцы масавых расстрэлаў людзей у перыяд сталінізму і праўду аб выніках раскопак незарэгістраваных пахаванняў у Шчакатоўскім лесе Гомельскага раёна, дзе былі знойдзены астанкі 70 чалавек. Пра гэта на прэс-канферэнцыі "Гомельскія Курапаты" ў Мінску заявілі ўдзельнікі грамадскага Аргкамітэта ўшанавання памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

Журналістам былі прадстаўлены відэазапісы ўспамінаў мясцовых жыхароў, якія сцвярджаюць, што ў Шчакатоўскім лесе менавіта ў 1937 годзе супрацоўнікі НКУС расстрэльвалі людзей.

Сустаршыня аргкамітэта пісьменнік Васіль Якавенка зачытаў заяву для прэсы і грамадскасці, у якой, у прыватнасці, адзначаецца, што ўлады ігнаруюць паказанні мясцовых жыхароў.

Заява

Аргкамітэта ўшанавання памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій

У маі-чэрвені 2007 года ў новабеліцкім лесе пад Гомелем праведзены раскопкі незарэгістраваных могільнікаў. Работы на плошчы прыкладна 1,5 га выкананы 52-м спецыялізаваным пошукавым батальёнам Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Знойдзены парэшткі 70 чалавек, невядома пры якіх абставінах расстраляных, запакаваны ў цэлафанавыя мяшкі і перададзены на часовае захаванне ў Прыбыткоўскі сельскі савет. Створана зацверджаная ў аблвыканкаме камісія ўпаўнаважаных на чале з намеснікам Гомельскага райвыканкама Наталляй Аксёнавай дзеля высвятлення часу, абставін, прычыны гвалтоўнай гібелі людзей і перазахавання парэшткаў.

Раскопкі прыцягнулі павышаную ўвагу грамадскасці, якая зацікаўлена ў аб'ектыўным раскрыцці мінулых падзей, у праўдзівым адлюстраванні гісторыі. Справай гонару ўпаўнаважаных было даследаваць выяўленыя жыхарамі раёна патаемныя могільнікі і факт іх з'яўлення ў трагічныя часы, аргументавана адказаць на пытанне, хто расстрэльваў людзей у гэтым лесе: свае ці чужыя?

У створанай уладамі камісіі практычна не было спецыялістаў па прадмету даследавання, і, як паказвае наша перапіска з Гомельскім райвыканкамам і іншымі зацікаўленымі ўстановамі, усе надзеі камісіі ўскладваліся на судмедэкспертызу касцей. Тым часам Аргкамітэт па ўшанаванні памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій, а неўзабаве і Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры звярнуліся з лістамі на імя спадарыні Н.Аксёнавай, у якіх прасілі яе ўключыць у склад камісіі па даследаванні парэшткаў спецыялістаў — археолага А.Макушнікава з Гомеля і гісторыка А.Валахановіча з Мінска. Аднак наш зварот (з прапановай аб дапамозе камісіі) сп-ня Аксёнава ў сваіх лістах у адказ назвала "преждевременным и некорректным", маўляў, гомельская судмедэкспертыза яшчэ не дала свайго заключэння.

Нарэшце такое "заключэнне" прыйшло. Паводле яго, парэшткі няшчасных, што выяўлены ў агульных магілах пад Гомелем, праляжалі ў зямлі прыблізна 70 гадоў. Пры гэтым, аднак, загадчык аддзялення медыцынскай крыміналістыкі Гомельскага абласнога ўпраўлення Дзяржаўнай службы судмедэкспертыз Віталій Фралоў паведаміў карэспандэнтцы "Гомельскай праўды", што заключэнне недакладнае, з пагрэшнасцю плюс-мінус 15 гадоў! І гэта азначала, што судмедэкспертыза ў дадзеным выпадку не апраўдала ўскладзеных на яе спадзяванняў. Зацягвае прадастаўленне ў камісію акта аб выкананых пад Гомелем раскопках Упраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў вайны Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Яшчэ раз ацаніўшы сітуацыю, Беларускае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры звярнулася ў другі раз да сп-ні Аксёнавай (ліст за 20.07.2007г.) з той жа просьбай уключыць у склад камісіі спецыялістаў і падоўжыць даследаванне парэшткаў і абставін гвалтоўнай смерці людзей. Адказу Таварыства не атрымала, і тут з боку ўстановы, якую Н.Аксёнава прадстаўляе, груба парушаны дзяржаўны рэгламент узаемаадносін паміж установамі і юрыдычнымі і фізічнымі асобамі. Рэагуючы на пагардлівае маўчанне Аксёнавай, Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры звярнулася са скаргай у Адміністрацыю прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На пачатку жніўня Аргкамітэт па ўшанаванні памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій звярнуўся з лістом у Гомельскую раённую пракуратуру, у гэтым лісце ўтрымлівалася просьба: пасля няпэўнага заключэння судмедэкспертызы не спыняць справу, адкрытую пракуратурай па факце масавых забойстваў людзей, падоўжыць даследаванні парэшткаў сіламі іншых экспертаў і спрактыкаваных спецыялістаў.

Адказу на ліст пакуль што няма. Адзначаем і гэтакую недарэчнасць: камісіяй упаўнаважаных, як і ўвогуле мясцовымі ўладамі пры рашэнні задачы прывязкі да пэўнага часу ахвяраў ігнаруюцца паказанні мясцовых жыхароў, што таксама гаворыць пра іх нежаданне прыйсці да ўсебакова аргументаванага і аб'ектыўнага заключэння. Падобнае стаўленне ўлад да фактаў гісторыі ўжо мела месца пры раскопках незарэгістраваных могільнікаў у Шакатоўскім лесе пад Гомелем у 1994—1995 гадах, дзе ўсе знойдзеныя рэчы і іншыя крыніцы інфармацыі сведчылі пра ахвяры масавага тэрору у 1937—1938 гадах.

Такім чынам, **Аргкамітэт ушанавання памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій мае заявіць наступнае: пазбяганне публічнасці ў працы і негатыўнае стаўленне да грамадскіх ініцыятыў камісіі ўпаўнаважаных, створанай пры Гомельскім райвыканкаме дзеля вывучэння і перазахавання парэшткаў невядомых людзей, выклікае недавер як да гэтай камісіі, так і да гомельскіх улад увогуле.**

Калі гомельскія ідэалагічныя службы і райвыканкам будуць і надалей ухіляцца ад стварэння новай пашыранай і кампетэнтнай камісіі дзеля вывучэння і перазахавання парэшткаў, знойдзеных на незарэгістраваных могільніках у Прыбыткоўскім і іншых сельскіх саветах, **Аргкамітэт ушанавання памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсій прыме гэта як факт утойвання ад грамадскасці месцаў масавых расстрэлаў людзей падчас Вялікага Тэрору ў СССР і фальсіфікацыі абласнымі і раённымі адказнымі работнікамі вынікаў раскопак.**

НУ І НУ!

Надзвычайнае па дзёрзкасці здарэнне расследуе магілёўская міліцыя

На прахадной Клімавіцкага лікёра-гарэлачнага завода праваахоўнікі затрымалі вулічную палівачную машыну "ЗІЛ", за рулём якой знаходзіўся 28-гадовы мясцовы жыхар.

Міліцыянеры вырашылі праверыць металічную цыстэрну, бо часцяком кіроўцы хаваюць там скрадзеныя бутэлькі з гарэлкай. Але гэтым разам вынікі дагляду проста шакіравалі нават дасведчаных ахоўнікаў. У цыстэрне замест вады для паліўкі вуліц знаходзіўся... чысты спірт.

Натуральна, дакументаў на спецыфічны груз кіроўца не меў. І, натуральна, паліваць вуліцы спіртам ён таксама не збіраўся. Далейшы маршрут руху машыны цяпер высвятляюць следчыя.

ВЕРЫЦЬ — НЕ ВЕРЫЦЬ

Чыгунка абвясціла пра зніжэнне кошту білетаў

Кошт чыгуначных білетаў на праезд у пасажырскіх цягніках далёкага накіравання зніжаны на 22%. Як патлумачылі БелаПАН у прэс-службе Беларускай чыгункі, гэта звязана з тым, што аб'явіла аб зніжэнні тарыфаў ААТ "Российские железные дороги". Паколькі паміж дзвюма краінамі дзейнічае адзіная сістэма разлікаў, паніжэнне закране і Беларусь.

Наступнае зніжэнне тарыфаў на праезд у пасажырскіх цягніках далёкага накіравання адбудзецца 1 кастрычніка.

У прэс-службе патлумачылі, што сезоннае паніжэнне цэн закране кошт праезду на ўсе цягнікі далёкага накіравання, якія курсіруюць як у межах СНД і краін Балтыі, так і па тэрыторыі Беларусі.

Наталля КАРОТКАЯ.

АФІЦЫЙНА

Уладзімір МАЦВЯЙЧУК:

«Калі трэба некага падправіць — падправім...»

Міністр культуры Беларусі Уладзімір Мацвяйчук не хоча гаварыць, колькі грошай у гэтым годзе было выдаткавана на правядзенне акцыі "За Беларусь!" і не ведае, на якім конкурсе спявачку Ірыну Дарафееву абралі "тварам Беларусі".

Пра грошы

Міжнародны тэатральны фестываль "Белая вежа", які 8—18 верасня адбудзецца ў Брэсце, фінансуецца значна горш, чым палітычна-забаўляльная акцыя "За незалежную Беларусь". Да такой высновы можна было прыйсці, слухаючы даклад Уладзіміра Мацвейчука пра асноўныя культурніцкія падзеі, запланаваныя на верасень.

"Скрываць не буду — бюджэт у Міністэрства культуры невялікі, мы заўсёды лічым грошы, і ў гэтым годзе ў нас ёсць пэўныя фінансавыя праблемы, — *сказаў міністр.* — Нямала фінансавых сродкаў прыйшлося ўкласці ў творчую акцыю "За незалежную Беларусь"... Зараз падыходзіць такая пара, калі мы пачынаем лічыць літаральна кожную капейку — ну што зробіш... Вось на "Белую вежу" хацелася б паболей грошай выдзеліць, але на працягу года столькі прайшло мерапрыемстваў, што мы так, як прасіў Брэст, не можам паўдзельнічаць..."

"Народная воля" паспрабавала ўдакладніць у міністра, колькі грошай за гэты год было патрачана на акцыю "За Беларусь!".

"Творчая акцыя "За незалежную Беларусь" — гэта вартая творчая акцыя, у якой бралі ўдзел і вядучыя, і маладыя, і пачынаючыя дзеячы культуры, — *адказаў Мацвяйчук.* — Гэта вялікая колькасць канцэртаў, за якія артысты атрымліваюць нейкія ганарары. Мы не можам назваць суму ганарараў артыстаў, таму што потым пачнуць узнікаць пытанні: маўляў, чаму аднаму больш, а другому — менш. Што тычыцца агульных выдаткаў на акцыю, то з цэнтралізаваных сродкаў было выдаткавана менавіта столькі, колькі неабходна для правядзення творчай акцыі на годным узроўні".

Назваць канкрэтныя лічбы — няхай нават прыблізныя — міністр катэгарычна адмовіўся.

Пра Музычны тэатр

Міністэрства культуры пакуль не плануе мяняць дырэктара — мастацкага кіраўніка Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра.

Пра гэта Уладзімір Мацвяйчук сказаў "Народнай волі".

Нагадаем, што дырэктар Музычнага тэатра Аляксей Ісаеў вырашыў не працягваць кантракт з некаторымі вядучымі артыстамі. Сярод іх — заслужаныя артысты Беларусі Арнольд Ранцанц, Герман Казлоў, Валянціна Пятліцкая, Зінаіда Вяржбіцкая і іншыя. Артысты атрымалі пісьмовыя папярэджанні ад Ісаева аб пераходзе на разавыя выступленні. Зоркі аперэты лічаць, што такім чынам Ісаеў зводзіць з імі асабістыя рахункі. Таму яны звярнуліся да высокіх чыноўнікаў з просьбай разабрацца ў сітуацыі і адхіліць Ісаева ад пасады.

"У Музычным тэатры ідзе працэс, які ва ўсіх творчых калектывах праходзіць вельмі балюча, — *выказаў сваё меркаванне міністр.* — Сапраўды, прынята рашэнне аб тым, што пэўную колькасць творчых людзей, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, вывелі на дагаворныя адносіны. Ім прапанавалі заключыць адпаведныя дамовы і далі магчымасць падпрацоўваць у гэтым тэатры. У тэатры да гэтага, скажам так, рознае стаўленне. Гэты працэс ужо распачаўся пры завяршэнні тэатральнага сезона. Зараз адкрываецца новы сезон, мы плануем сустрэцца з калектывам тэатра, паразмаўляць. Калі трэба некага падправіць — падправім, трэба дапамагчы — будзем дапамагаць. Але я разумею сітуацыю так: гэта той выпадак, калі ідзе працэс замены артыстаў старэйшага пакалення творчымі сіламі, якія падраслі і гатовыя іх замяніць.

Ніхто не разглядае сёння пытанне аб тым, каб з-за гэтай спрэчкі звольніць дырэктара тэатра. Трэба супакоіцца, паглядзець... Я думаю, справа там не ў тым, што дрэнны дырэктар..."

Пра «твар Беларусі»

Як ужо шмат разоў паведамлялася, спявачка Ірына Дарафеева з нядаўніх часоў стала "тварам Беларусі". "Народная воля" пацікавілася ў міністра, ці раіліся з ім, калі рабілі гэты выбар.

"А што, быў конкурс які-небудзь?" — *перапытаў Уладзімір Фёдаравіч. І, пачуўшы, што зорку эстрады без усялякіх конкурсаў аб'явілі "тварам краіны", дадаў:* "Тады, напэўна, трэба спытаць у тых, хто яе аб'явіў..."

Марына КОКТЫШ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 ВЕРАСНЯ 2007 г.

ПЕРСОНА

Михаил Подоляк по-прежнему разрушает репутации политиков

Три года назад из Беларуси депортировали журналиста Михаила Подоляка. “Народная воля” решила узнать, как сложилась его жизнь

— Миша, сразу после депортации ты на несколько дней заехал к родителям в Луцк, а затем начал активно работать в столице Украины. Что было тяжелее — найти в Киеве жилье или работу?

— С работой вообще никаких проблем не было. В наше виртуальное время она от тебя никуда не уходит, независимо от того, в какой географической точке ты находишься.

Что касается жилья, то скачок цен на недвижимость в Украине и в Беларуси начался в конце 2004 года. Так что меня вовремя депортировали *(смеется)* — мы с женой успели купить новое жилье по более-менее нормальным ценам. А сегодня цена двухкомнатной квартиры в Киеве выше, чем цена аналогичной квартиры, скажем, в Варшаве, Праге и Будапеште.

— Чтобы купить жилье в Киеве, твоя супруга продала квартиру в Минске...

— Да, но на квартиру в Украине этих денег нам все равно не хватило. Пришлось, мягко говоря, немного доложить.

— То есть все украинские гонорары ушли на покупку и обустройство квартиры...

— Я всю жизнь занимался проектами не только в Беларуси, но и в России, Украине. Информационная среда глобализирована, и если ты профессиональный журналист-информационщик, то всегда будешь востребован.

— Одно время ты был главным редактором “Украинской газеты”. А недавно, насколько я знаю, открыл свое пиар-агентство. Похоже, в Украине проще, чем у нас, зарегистрировать издание и организовать собственный бизнес...

— Какие-то вещи в Украине действительно делать намного проще. Но быть редактором газеты — гораздо сложнее. Тут много средств массовой информации, динамичный, высококонкурентный медийный рынок, на котором надо обязательно выделиться. В Украине, в отличие от Беларуси, нет дефицита информации, поэтому твою газету будут покупать лишь в том случае, если она действительно интересна.

В Беларуси очень много талантливых журналистов, но они не востребованы. Поэтому готовы прийти в твой проект и работать даже за ничтожную сумму, не сопоставимую с уровнем их профессионализма. В Украине все наоборот. Рынок перегрет, и за счет этого здесь дефицит классных специалистов — журналистов катастрофически не хватает.

— А сильно ли отличаются заработки украинских и белорусских журналистов?

— Средняя зарплата классного журналиста в Беларуси может колебаться от 200 до 600 долларов. А зарплата хорошего журналиста в Украине — от 800 до 2000 долларов. Но белорусские журналисты по своей компетентности, повторяю, на голову выше украинских собратьев. Еще в Украине очень высока миграция журналистов из издания в издание, что, безусловно, сказывается на качестве продукции. В Беларуси такого нет. Но если в белорусский медийный рынок сегодня вложить хорошие деньги, завтра в стране появится десяток высокопрофессиональных проектов, конкурентных даже по строгим европейским меркам. Однако денег и крупных инвесторов пока нет. С другой стороны, официальный Минск вкладывает крупные суммы исключительно в пропагандистские агитки, которые на внешних рынках вызывают просто смех...

— Расскажи про свое пиар-агентство.

— У меня своя фирма не только в Украине, но и в России. Но я бы не называл это пиаром — во-первых, это очень узкое направление, а во-вторых, сейчас уже не модно говорить “пиар”, это устаревшее слово. Сейчас ведут речь о создании и разрушении репутаций. Репутационный менеджмент — это гораздо шире, чем просто журналистика.

— Интересно, белорусские политики обращаются в твои репутационные агентства?

— Конечно. Я со многими поддерживаю отношения. Другой вопрос, что я не могу назвать, кто именно обращается. По этическим и политическим причинам.

— Но эти люди представляют власть или оппозицию?

— Я контактирую не только с оппозиционными политиками. В противном случае мое понимание ситуации в Беларуси стало бы односторонним. Хочешь знать правду — води дружбу и с правыми, и с левыми. Я всегда довольно скептически относился к белорусским политикам, вне зависимости от того, представляют они власть или оппозицию. Со стороны и те, и другие выглядят достаточно карикатурно. Не понимают, что делать и как делать. У них нет стратегических трендов, они не понимают, куда двигаются, что хотят получить на выходе. Они воюют друг с другом, живут сегодняшним днем. А что будет завтра? А послезавтра? Более того, некоторые из этих политиков, особенно те, кто находится в проправительственной группе, думают, что схватили Бога за бороду и будут пожизненно сидеть на верхушке власти. Например, до недавнего времени так думал бывший председатель КГБ Степан Сухоренко. Хотя его не раз предупреждали, что он может очень больно упасть. И таких примеров очень много в Беларуси...

— Миша, в Минске у тебя периодически случались проблемы с представителями власти. Как у тебя складываются отношения с украинскими чиновниками? Они, как и белорусские, так же нервно реагируют на критику в свой адрес?

— В Украине я имею возможность легально себя защищать. Например, я провел большой цикл расследований по поводу отравления президента Ющенко в 2004 году. Расследования потрясли многих. Мне звонили домой некоторые министры и просили, чтобы я делал это мягче. Но они звонили и просили. После этого расследования я стал официальным свидетелем по делу об отравлении, давал показания в Генеральной прокуратуре. Я считаю, что если журналист работает профессионально, то он должен проходить через подобные процедуры, обязан отвечать за написанное и должен иметь возможность защищать свою правоту. В Беларуси у журналистов нет возможности легально защитить свою правоту. И если сверху будет дана команда уничтожить журналиста, то никакой белорусский суд его не спасет. Закон не работает, работает только право сильного. В этом принципиальное различие между Украиной и Беларусью.

